# Хроніка мастацкіх падзей

* * *

Медыяцэнтр ВДУ імя П.М. Машэрава стаў сярэбраным прызёрам Міжнароднага конкурсу медыяпраектаў “Студэнцкая моладзь у сучасным свеце”, арганізаванага Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства асветы Расійскай Федэрацыі. Дыпломам 2-й ступені ў намінацыі “Новыя медыя” быў узнагароджаны студэнцкі інтэрнэт-часопіс «VSUonline» (аўтары: А. Юхно, Н. Тарарышкіна; кіраўнік – А. Краўчанка).

* * *

Тэлебачанне ВДУ імя П.М. Машэрава стала ўладальнікам дыплома 3-й ступені Рэспубліканскага адкрытага конкурсу аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча “Я здымаю кіно” ў намінацыі “Тэматычная праграма” за цыкл праграм аб Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава. На суд журы было прадстаўлена больш за 200 твораў кінематаграфіі з пяці краін: Беларусі, Расіі, Эстоніі, Украіны і ЗША.

.* * *

У межах новага праекта “ProИскусство” тэлебачанне ВДУ імя П.М. Машэрава прадставіла першы выпуск праграмы “Скульптура”. Госцем яе стаў дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта, вядомы беларускі скульптар і мастак Сяргей Сотнікаў.

* * *

Вызначаны пераможцы Рэспубліканскага завочнага конкурсу мастацкай творчасці студэнтаў “АРТ-партал – 2020”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел творчыя аб’яднанні і асобныя аўтары з 30 навучальных устаноў. ВДУ імя П.М. Машэрава прадставілі “Медыяцэнтр ВДУ” і аддзел студэнцкай творчасці і культурна-займальнай дзейнасці.

У напрамку “Інфармацыйныя камп’ютарныя тэхналогіі” ў намінацыі “Студыя-АРТ. Прасоўваем творчасць” першае месца заняла творчая група інтэрнэт-часопіса VSUonline “# творчествоВГУ” (А. Юхно, Н. Тарарышкіна, Ю. Прышчэпа, В. Ханіс, Я. Багатырова, Н. Радзеўская, І. Шыркевіч; кіраўнік – А. Краўчанка). У напрамку “Відэа” ў той жа намінацыі другое месца атрымаў цыкл рэпартажаў медыяцэнтра ВДУ (Я. Багатырова, А. Гергаеў, А. Семенчанка; кіраўнік – А. Краўчанка), а таксама праект музычных віншаванняў “МузВуз” творчай групы аддзела студэнцкай творчасці і культурна-займальнай дзейнасці (кіраўнікі: А. Бортнікаў, А. Гулідава). У напрамку “Відэа” ў намінацыі “Творчае ператварэнне: ствараючы будучыню” трэцяе месца заняў медыяцэнтр ВДУ з відэаролікам “ Усім спорт!” (А. Гергаеў, А. Краўчанка).

* * *

Напрыканцы 2020 года былі падведзены вынікі адкрытага конкурсу па распрацоўцы афіцыйнага лагатыпа для Савета маладых навукоўцаў пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пераможцам стаў праект студэнткі мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава Кацярыны Кавалёвай. 22 студзеня 2021 года распрацаваны ёю лагатып быў зацверджаны як афіцыйны.



Репозиторий ВГУ

* * *

У складзе членаў журы Міжнароднай дзіцячай мастацкай выстаўкі-конкурсу “Прагулка з дзецьмі па мастацтве”, прысвечанай І.Я. Рэпіну, працавалі дэкан мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава А. Сакалова і дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва М. Цыбульскі. Яе адкрыццё адбылося ў студзені 2021 года ў Міжнародным універсітэцкім цэнтры (MIUC) у горадзе Марбелья (Іспанія). Ініцыятарам выстаўкі выступіў Саюз расійскіх суайчыннікаў у Іспаніі. Сярод арганізатараў – Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Міжнародны ўніверсітэцкі цэнтр (Марбелья), студыя “South Beach Art & Design Studio” (ЗША). На выстаўцы экспануецца 85 работ дзяцей і падлеткаў ад 5 да 18 гадоў з 16 краін: Расіі, Беларусі, Украіны, Вялікабрытаніі, Малдовы, Іспаніі, Ізраілю, Кіпра, Харватыі, Арменіі, Румыніі, Сербіі, ЗША, Германіі, Аўстрыі, Казахстана. З беларускага боку прадстаўлена 30 малюнкаў навучэнцаў Віцебскай дзіцячай мастацкай школы № 1. Пасля Іспаніі выстаўка адправіцца ў Фінляндыю і Расію. Фінальная частка вялікага міжнароднага праекта адбудзецца ў Віцебску ў Мастацкім музеі (філіял ВАКМ) у маі – чэрвені 2021 г., дзе адбудзецца падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў.

* * *

2 лютага ў зале мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава адбылося адкрыццё выніковай выставы жывапісных работ магістрантаў ВДУ, грамадзян КНР, “Беларусь – Кітай. Дружба і супрацоўніцтва” (куратар Ю. Багданава). Кожны з удзельнікаў, працуючы пад кіраўніцтвам прафесара кафедры выяўленчага мастацтва Р. Фядзькова, падрыхтаваў па 5–6 работ, лепшыя з якіх можна ўбачыць у гэтай экспазіцыі. Сярод кампазіцый летнія вясковыя і гарадскія пейзажы.

* * *

Уладальнікамі спецыяльнага прыза ВДУ імя П.М. Машэрава “Docendo discimus” у намінацыі “За ўклад у развіццё мастацтва і культуры” сталі: старшы выкладчык кафедры дызайну Аляксандр Сяргееў (за ўклад у эстэтычнае афармленне інтэр’еру і экстэр’еру ВДУ імя П.М. Машэрава); майстры вытворчага навучання кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі Аксана Прачкіна і Святлана Козырава (за папулярызацыю нацыянальных традыцый беларускага мастацтва, арганізацыю выставачнай дзейнасці па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве).



Репозиторий ВГУ